**Прэс-рэліз**
**"Назіранне за выбарамі: тэорыя і практыка"**
**Belarus Watch**
**Парламенцкія выбары, Эстонія, 6 сакавіка 2011**

**6 сакавіка 2011 гада група кароткатэрміновых міжнародных назіральнікаў праекта "Назіранне за выбарамі: тэорыя і практыка", акрэдытаваных ад няўрадавай арганізацыі "Belarus Watch", назірала за правядзеннем парламенцкіх выбараў у Эстоніі. Назіральнікі засяродзілі сваю ўвагу на працэдурах падчас дня галасавання, а менавіта на адкрыцці выбарчых участкаў, галасаванні і падліку галасоў. Назіральнікі наведалі 135 выбарчых участкаў па ўсёй Эстоніі (22% усіх выбарчых участкаў). Місія ацаніла працэс галасавання, на аснове міжнародных стандартаў і прынцыпаў АБСЕ, а таксама Закона аб выбарах Эстоніі.**

У цэлым, выбарчы працэс падчас галасавання быў арганізаваны вельмі добра, што было адзначана ўсімі камандамі місіі. Прадстаўнікі камісій, якія працуюць на выбарчых участках, былі адпаведным чынам падрыхтаваны, адкрыты для супрацоўніцтва, лёгка ішлі на кантакт і былі гатовыя даць вычарпальную інфармацыю назіральнікам і выбарцам. Супрацоўнікі эфектыўна прадухілялі выпадкі галасавання ў групах (чальцамі сем'яў).

Па запыце інфармацыя давалася выбарцам вусна і на іншых мовах, апроч эстонскай.

Практыка папярэдне складзеных бюлетэняў, што выкарыстоўвалася на  выбарчых участках, спрыяла гарантыі выканання прынцыпу таемнага галасавання.

Інструкцыі, што былі змешчаны на сценах выбарчых участкаў, былі карысныя выбарцам і назіральнікам, ясна тлумачылі этапы галасавання.

Варта адзначыць і высокі ўзровень культуры выбарцаў і разумення імі працэдур.

Аднак мы хацелі б выказаць нашу занепакоенасць з нагоды істотных адхіленняў падчас працэсу падліку галасоў. Адсутнічае адзіная практыка падліку галасоў; працэдуры не выконваліся. Бюлетэні, якія не былі скарыстаны на працягу дня, не былі згашаны, як таго патрабуе працэдура, да таго часу, пакуль падлік галасоў не быў скончаны.

Падлік галасоў не быў празрыстым на ўсіх выбарчых участках, лічбы часам не супадалі. Былі выпадкі, калі падчас запаўнення адмысловай формы было выяўлена, што некалькі бюлетэняў адсутнічае.

Падыходы да запаўнення пратаколу таксама адрозніваліся. Усяго некалькі каманд змаглі ўбачыць лічбы ў ім, інфармацыя не давалася нават па запыце. Спосабы дастаўкі пратаколу ў Нацыянальны выбарчы камітэт таксама былі розныя на розных участках.

Выпраўленне разыходжанняў у рэзультатах падліку насілі непразрысты характар; каментароў ці тлумачэнняў на гэты конт амаль не было.

Невыконванне шэрагу правіл прывяло да сур'ёзных сумневаў у дакладнасці рэзультатаў на некаторых участках, дзе назіралі прадстаўнікі місіі.

Адсутнасць строгай паслядоўнасці дзеянняў пры падліку таксама прывяла да пэўных праблем.

Што да іншых працэдур, кабіны для галасавання ў асобных выпадках былі не дастаткова шырокімі і не хавалі ўсяго іх памяшкання. Таксама было складана распазнаць назіральнікаў і іншых аўтарызаваных і неаўтарызаваных людзей, паколькі таблічкі з імёнамі былі толькі ў чальцоў камісій. Часта назіральнікаў не прасілі паказаць дакументы.

Нягледзячы на пералічаныя адхіленні, дзень выбараў быў праведзены прафесійна і спакойна, а таксама ў адпаведнасці з міжнароднымі і нацыянальнымі стандартамі.

Усяго ў склад місіі ўвайшло 28 назіральнікаў з Беларусі, Швецыі і Літвы. Місія была арганізавана ў межах праекта "Назіранне за выбарамі: тэорыя і практыка", які ажыццяўляецца ў партнёрстве трыма арганізацыямі: Belarus Watch, Еўрапейскім гуманітарным універсітэтам і Беларускім домам правоў чалавека ў Вільні. Папярэднія місіі праекта праходзілі ў Нарвегіі, Грузіі, Літве, Украіне, Польшчы, Швецыі, Латвіі і ў Беларусі.

Кантактная асоба: Анастасія Матчанка, +372 582 42 868.